НАША БУДУЧЫНА

081585 1-6

Цана асобнага нумару 200 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Воостабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 800 м. п. Для загараніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надруко ванага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 1. 127937 **Субота, 6-га студня 1923 г.** **Год II.**

Дэмонстрацыя сілаў.

З нараджэньнем Новага 1923 году мімаволі паўстае ў думках нашых пытаньне, што нясе з сабою гэты год?

Катэгорыя людзей, што жывуць адныйі толькі ўласнымі, асабістымі інтарэсамі, прасьцей кажучы, звычайным мізэрным жыцьцём чалавечае асобы—гэткая катэгорыя людзей, вядомая пад агульнай назвай мяшчанства, гадае аб сваіх уласных інтарэсах, аб сваёй асабістай будучыне ў бліжэйшым годзе.

Іншая катэгорыя людзей, што жывець інтарэсамі (палітычнымі і соцыяльнымі) шырокіх народных масаў, гадае аб будучыне гэтых масаў. У самым пачатку году мы ня можам ня спыніцца над вострым пытаньнем:

Ці год гэты будзе такім, як і ранейшыя гады, годам нацыянальнай няволі і соцыяльнага занепаду для Народу Беларускага?

За якіх-нібудзь тры-чатыры апошнія гады мы бачылі, як дзякуючы нячуванай усясьветнай калатне, а таксама й народжанай ёю соцыяльнай рэвалюцыі, — народы, дасюль быўшыя паднявольнымі, завалушыліся і сталі самі незалежнымі гаспадарамі свае долі, сталі суварэннымі дзяржаўнымі арганізмамі.

Аднак-жа, хоць і не малы сам па сабе кавалак часу—год у нашыя дні, мы можам не гадаючы доўга сказаць, што ня ведаем, які будзе для нашага народу бягучы год.

Надта-ж вялікая трагэдыя перажываецца Беларускім Народам, надта цяжкая яго сучаснасьць, каб можна было лёгка згадаць дзень і час яго лепшае, сьветлае будучыны.

Той, што толькі вось мінуў — другі год крывавага падзелу Беларусі, прайшоўшы 1922 год, асабліва канец яго, даў магчымасьць Заходняй часьці Беларусі трымаць экзамен на палітычную сьпеласьць.

Экзамен гэты—выбары ў Сойм Польскае Рэспублікі. І добра, ці дрэнна экзамен гэты ўсё-ж такі вытрыманы.

Там, дзе, як відаць, гарантыі палітычнае роўнасьці зьяўляюцца досыць моцнымі ня толькі ў тэорыі, пісаныя пад вэрсальскую дыхтоўку, конституцыі,—там, як напр., у Латвіі й Літве, беларускія сьпіскі не набіралі пры выбарах на тэй ці іншай прычыне патрэбнага ліку галасавальнікаў. І афіцыяльных прадстаўнікоў у законадаўчых установах названых дзяржаваў беларусы ня маюць.

Тут, дзе абрыдла чуць аб гэтак знаёмай па маскоўскіх часах сваволі адміністратараў, аб адсутнасьці цьвёрдага правапарадку ды аб поўным, нарэшце, нахаваньні, шляхоцкага лёзунгу „роўныя з роўнымі, вольныя з вольнымі“,—тут краз адбылася ў пачатку лістапада 1922 г. досіць паважная дэманстрацыя сілаў непрызнаванага Польшчаю беларускага сярмяжнага народу.

Рэзультат гэтае дэманстрацыі—13 прадстаўнікоў беларускага народу ў законадаўчых установах Польшчы, прадстаўнікоў прайшоўшых па сьпіску нацыянальных меншасьцяў плюс 4 беларусы ў Сойме, прайшоўшых па сьпіску радыкальна-мужыцкае партыі „Вызваленьне“.

Рэзультат гэткі зьяўляецца юрыдычным довадам таго, што беларусы ў Польшчы ўсё-ж такі ёсьць, што іх ня так ужо й мала, як здавалася ў Бэльвэдэры, што ня так ужо яны абсолютна слабыя, як думалі пэ-пэ эсы, што жывучыя яны на страх і зьдзіўленьне паноў эндэкаў.

Палітыка няпрызнаваньня нашага народу, як асобнае нацыянальнасьці з боку офіцыяльнае Польшчы, вытварыла сярод працоўных беларускіх масаў зусім зразумелую апазыцыю гэтай палітыцы і значная група афіцыяльных прадстаўнікоў у Сойме і Сэнаце засуджана на далейшую апазыцыю проці душыўшага нас палітычнага курсу.

Ня ўся маса нашага гаротнага народу, ўлучанага гісторыяй дзён нашых у польскі дзяржаўны арганізм, прыняла ўдзел у сказанай вышэй дэмонстрацыі сілаў, бо галасавала толькі каля паловы прызванага да гэтага насяленьня.

А значыць моцныя рэзэрвы яшчэ жывы, барацьба за свае ідэалы цягнецца далей і не сягоньня, дык заўтра, ў нікім невядомы час блізкай, ці далёкай будучыны стане фактам інакшае, вольнае жыцьцё нашага народу.

К. М.

Палітычныя падзеі.

Нямеччына. Урад зацьвердзіў буджэт на 1923 г., які перавышае адзін більён марак.

Савецкая Беларусь. С.Н.К. далучыўся да праекту Сав. Украіну аб стварэньні Саюзу Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік замест Р. С. Ф. С. Р.

Саюз Народаў. У студні 1923 г. мае адбыцца нарада Саюзу Народаў, які да гэтага часу ні разу не разьвязаў ані аднэй справы і ма быць не развяжа і ў будучыне.

Літва. Рада амбасадараў прызнала Літву de jure. У склад Новага Сойму увaходзяць: 38 хрысьціян.-дэмак., 20 соцыял. народ., 10 соц. дэмакр., 5 камуністаў, 3 жыды і 2 палякі. У 1923 годзе урад мяркуець раздаваць 7.080.000 гэкт. зямлі, а таксама занянца гаспадаркай зямлі быўшага Расейскага Зямельнага банку.

Польшча. Э. Невядомскі, забойца прэзыдэнта Нарутовіча, 30 сьнежня атрымаў прысуд кары сьмерці. Прысуд будзе выканаць 25 студня. Мініcтар фінансаў Ястржэмбскі вышаў у адстаўку. 10 студня адбудзецца першае пасьлявыбарнае паседжаньне Сойма.

Італія. Верхавод фашыстаў Мусоліні етаўшы на чале ўраду стараецца ажыцьцявіць свае думкі. Па яго загаду звольнена 60.000 чыгуначнікаў, каб гэтым „зменшыць“ дзяржаўныя выдаткі. Час вайсковай службы павялічыў на 18 месяцаў. У усіх школах уведзены Закон Божы.

Галіччына. Закончана следства 39 камуністаў. 9 засуджаным пагражае кара сьмерці.

Канфэрэнцыя Балтыцкіх Дзяржаваў. У лютым месяцы мае адбыцца канфэрэнцыя Балтыцкіх дзяржаў і Польшчы для разгляду эканамічных пытаньняў.

◆◆◆◆

У справе арыштаваных беларусаў.

Беларускі Пасольскі Клюб зяажыў у Сойме гэткую інтэрпэляцыю, скіраваную да Міністра Справядлівасьці:

У лютым месяцы 1922 году па распараджэньню палітычнае паліцыі былі арыштаваны і пасаджаны ў Беластоцкі астрог беларусы—В. Масьлоўская, Матэйчук, А. Парук, А. Трыпуза, С. Жабінскі і шмат іншых.

У чэрвені месяцы па распараджэньню тэй-жа паліцыі арыштаваны і пасаджаны ў Гарадзенскі астрог беларусы— П. Юрэчка, В. Юрэчка, А. Маленкевіч і шмат сялян беларусаў.

Усіх арыштаваных у сучасны момант ў адным і другім астрогах знаходзіцца да 80 асобаў.

Ня гледзячы на такі доўгі час, паняных арыштаваных дапрашывалі дагэтуль па аднаму разу, і калі справа аб іх будзе вырашана—няма ведама.

Знаходжаньне ў вастрогах у працягу гэткага значнага часу, пры пануючых там пэўных адносінах адміністрацыі да арыштаваных, адбіваецца на здароўі апошніх, пагражаючы для некаторых сьмерцьцю. Яскравым прыкладам адносін да арыштаваных можа служыць гэткі факт у Беластоцкім астрозе—пасьледчыя палітычныя пастаўлены ў аднакавыя варункі з засуджанымі крымінальнымі; кнігі, газэты забаронены, прымушаюць націраць цэмэнтовую падлогу, бо яна блішчэла і г. д.

На падставе вышэй паданага падпісаныя пытаюць у п. Міністра Справядлівасьці:

1) Ці ведама аб памянёнай тут справе і аб адносінах адміністрацыі да арыштаваных.

2) Ці мае ён даць загад аб зьмене адносін да арыштаваных.

3) Калі будзе закончана гэтая справа і ці могуць быць звольнены з астрогаў памянёныя арыштаваныя.

(На арыгінале подпісы С. Баранава і іншых дэпутатаў.)

◆◆◆◆

Новая абяцанка.

Прадстаўнік Беларускага Пасольскага Клюбу пасол Баран, сэнатар Каспэровіч і два прадстаўнікі ад Украінскага Пасольскага Клюбу 30 сьнежня 1922 г. былі прыняты прэзыдэнтам Рады Міністроў Сікорскім.

Прадстаўнікі былі ў справе вываза Гарадзенскага Япіскапа Уладзімера. Адначасна пасол Баран запытаўся ў гэткія пытаньні:

1. Аб бясправнай высылцы грамадзян не маючых польскага падданства паветовымі старастамі.
2. Аб арыштаваных за прадвыбарную агітацыю.
3. Аб канфіскаваным № 2 „Нашае Будучыны“.
4. Аб адбудове краю.
5. Аб правох Беларускага Народу.

На ўсе пытаньні п. Сікорскі даў заспакаваючыя адказы, абяцаючы разгледзіць закранутыя справы і выдаць адпаведныя загады.

Што да правоў Беларускага Народу, дык п Сікорскі заявіў, што зробіць усё магчымае, каб правы Беларускага Народу былі запэўнены ў рамках польскай канстытуцыі. Прэзыдэнт Міністраў лічыць істнуючыя да гэтага часу варункі на kresach не нармальнымі, віной якіх ёсьць польская адміністрацыя. Пасол Баран заўважыў, што каб зьменшыць пануючы антаганізм на беларускіх абшарах, дык да 90 працэнтаў трэба зьмяніць цяперашняй адміністрацыі. З гэтым згодзіўся п. Сікорскі і прасіў злажыць яму адпаведны мэмор'ял.

„Войска, якое з сабой я прывёў для зьніштажэньня панаваньня гвалтаў і здзеку, для таго, каб скінуць уладу над краем супроць волі народа, войска гэтае нясе ўсім вам волю і свабоду“.

(I. Piłsudski. Odezwa wileńka. 1919 г.).

42046

С. К.

Задачы соцыяльнае страхоукі.

Па ўсёй Польшчы цяпер закладаюцца касы хворых, ў якіх сябры іх страхуюцца на выпадак хваробы. Гэтым чынам выходзіць, што амаль ня кожны чалавек уваходзіць, ці павінен увайсьці ў тыя, ці іншыя адносіны з Касаю Хворых. Амаль што кожны чалавек павінен альбо сам быць сябрам гэтае касы, альбо за каго-нібудзь з сяброў яе, які ў яго працуе, ці служыць, плаціць складкі.

Шмат каму здаецца, быццам каса хворых—непатрэбная, або нават бескарысная рэч, што адбірае толькі ў добрых людзей час і грошы. Можа быць, што гэтак думаюць навет рабочыя і служачыя, дзеля якіх і закладаюцца гэтыя касы. Пагляд гэткі тлумачыцца тым, што пры пачатку касы працуюць вельмі блага, ніяк ня могуць нарыхтавацца на добры лад і гэтым усім робяць шмат клапоту й турботаў. Апрача гэтага кожны, плацячы грошы ў касу, не спадзяваецца так хутка адтрымаць ад яе карысьць, бо спадзяваецца заўсёды быць здаровым, альбо асьцерагчыся ад хваробы.

Прасьцей кажучы, так ці йначай, заўсёды можна знайсьці што-нібудзь проці касы хворых і праз гэта быць проці яе.

Аднак-жа гэткі пагляд на гэтую справу зьяўляецца зусім няправільным. Перш за ўсё трэба памятаць, што гэта справа ня простая, вялікая, што людзей, якія гэтую справу добра знаюць і адразу могуць паставіць, як трэба ёсьць вельмі мала. Дый наагул-жа рэдка ўдаецца ў соцыяльнай практыцы ўсё адразу нарыхтаваць добра, дый яшчэ ў гэткі час, як мы цяпер перажываем, тым больш, што пры гэткай практыпы заўсёды знойдзецца даволі праціўнікаў, якім гэта ў іх клясавых інтарэсах нявыгадна, цераз што яны й перашкаджаюць усімі сіламі правільнаму правядзеньню гэтае справы, або закону ў жыцьцё.

Дзеля гэтага пастараемся ясна й акуратна выясьніць, нашто гэткія касы істнуюць, што яны даюць сваім сябрам і якое яны маюць соцыяльнае значэньне наагул.

Касу хворых, як ведама, істнуюць толькі для людзей працоўных—для людзей, якія ў каго-нібудзь і дзе-нібудзь працуюць, альбо служаць, ня гледзячы на тое, якою зьяўляецца іх праца, альбо прафэсія. І дырэктар фабрыкі, ці банку, і звычайны канторшчык, і рабочы, і старажы, і прыслуга ў прыватных дамох—усе павінны быць сябрамі Касы Хворых. А асноваю добрабыту і нават проста істнаваньня гэткага працоўнага чалавека зьяўляецца, нарэшце, як павінен кожны прызнаць—яго сіла, яго здароўе. Пакуль чалавек здаровы—ён можа працаваць і гэткім чынам зарабляць на сваё і сям'і свае й істнаваньне. Адсюль ясна, якою грознаю азнакаю краху стаіць перад чалавекам, адзінае багацьце якога праца,—небясьпека захварэць. А хвароба якраз найахватней і найчасьцей адведавае дом працоўнага чалавека. Нямецкай рабочай статыстыкай выясьнена, што з кожных трох рабочых адзін абавязкова раз на год хварэе на якую-нібудзь хваробу і хвароба гэта зацягваецца амаль што на цэлы месяц, а ласьне на 27 дзён. Трэба яшчэ памятаць, што хвароба б'е чалавека з двох бакоў: з аднаго—яна пазбаўляе яго заробку, а з другога яшчэ змушае лячыцца, што заўсёды каштуе як ведама, нятанна.

Аб нашым краі няма статыстычных данных, падобных да прыведзеных ніжэй аб Нямеччыне. Але-ж мы й без таго ведаем, што наш народ бяднейшы, варункі яго жыцьця горшыя і што праз гэта хваробы на ім адбіваюцца яшчэ мацней.

Дзеля ратунку ад пасьледстваў, якімі пагражаюць хваробы, рабочая кляса даўно ўжо пачала гарнуцца да аб'яднаньняў у спэцыяльных арганізацыях, саюзах, касах і г. п., ў якіх на асновах узаемнае страхоўкі даецца сябрам у выпадку хваробы неабходная матэрыяльная й лячэбная падмога. У Вільні дый у іншых гарадох нашага краю можна, напрыклад, прасачыць на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў назад істнаваньне гэткага роду ўспамагальных касаў сярод жыдоўскіх і хрысьціянскіх рабочых цэлага раду майстроўскіх цэхаў.

Цьвёрды й шырокі грунт, гэтая сыстэма забясьпечаньня на выпадак хваробы атрымала з правядзеньнем у Нямеччыне ў 1885 годзе дзяржаўнага страхаваньня рабочых на выпадак хваробы. Дзеля рабочае клясы, дзякуючы гэтаму, адбылася вялізная палёгка, бо значная часьць матэр'яльнага цяжару забясьпечаньня была перанесена на плечы й гаспадароў, ня кажучы ўжо аб тым якою важнаю клясовай перамогаю для яе зьяўлялася прызнаньне дзяржаваю абавязку дбаць аб здароўі і дабрабыце рабочае клясы.

Гэтак, на выпадак страты заробку праз хваробу кожны, хто працуе, страхуецца ў спэцыяльна закладзенай дзеля гэтага інстытуцыі — касе хворых. Патрэбныя кошты даюць самі застрахаваныя й іх працадаўцы, адлічаючы з заробку першы пэўны працэнт. Ён нязроўны, але наагул, як гэта відаць па статыстычных даных у Нямеччыне, амаль што тры чэцьверці касаў хворых у 1920 г. бралі ад 4 да 6 проц. Рэч зусім пэўная, што разьмер працэнтаў складкі зьяўляецца не выпадковым, а мае пад сабой пэўны грунт, збудованы па вядомым абрахунку. Бо каса хворых прызвана пакрыць страты, што паўстаюць у рабочага, або служачага з прычыны хваробы. Як ўжо сказана было вышэй страты гэтыя паўстаюць ад згубы заробку і ад расходаў на лекі.

Калі кожны трэці рабочы хварэе ў працягу году 27 дзён, як мы ад'значалі вышэй, дык, значыцца, на аднаго рабочага ў сярэднім прыпадае 9 дзён хваробы. Рабочы год аблічваецца ў 300 дзён, значыцца 9 дзён хваробы будуць роўнымі 3 прац. Гэткім чынам, толькі на зварот згубленага з прычыны хваробы заробку,—што адбываецца праз выдачу касаю падмогі, — патрэбна 3 процэнты заробку. Праўда, каса хворых не вяртае ўсяе згубы заробку, г. знач. выдае падмогу ў меншым разьмеры, а ласьне $^2/_3$, ці $^3/_4$ заробку, але затое яна дае грашавую падмогу і ў іншых выпадках: на нахаваньне памёршых, выдае іншы раз грашавую падмогу і сябрам сем'яў і г. д.; нарэшце, ў ліку гэтых самых 3 прац. касы робяць свае расходы на вядзеньне справы.

Нарэшце, на лячэбную падмогу ўва ўсіх яе формах патрэбны расходы ў тым самым разьмеры, як і на грашавую падмогу і інш., г. знач. яшчэ 3 проц. ад заробку і агулам 6 проц. Ведама што, калі тыя, ці іншыя касы зьбіраюць складкі ад сваіх сяброў у меншых разьмерах, дык гэта значыць, што яны даюць меншую падмогу, або, йначэй кажучы, пакрываюць меншую часьць стратаў, нанесеных хворымі сябрамі касы.

У сваю чаргу складка ў касу хворых дзеліцца ў адпаведнай прапорцы паміж гаспадарамі й работнікамі. На гэты бок больш за ўсё і скіроўваецца скаргаў, асабліва з боку гаспадароў, якія лічаць гэтыя наложаныя на іх дзяржаваю вкладкі за нанятых імі рабочых, новым, саўсім несправядлівым падаткам, тым болей, што ўва ўсёй справе зацікаўлены адны толькі працаўнікі.

Не вялікі труд даказаць наіўнасьць гэтых скаргаў, відочную і для саміх тых, хто скардзіцца. Эканамічная тэорыя даўно ўжо ўстанавіла, што працадаўца, выкарыстываючы працу ў яе здаровым становішчы, гэтым самым абавязаны нясьці расходы па ўтрыманьню працы ў хваравітым становішчы і па яе аднаўленьню, падобна да таго, як ён робіць расходы на рэмонт машынаў, ці іншых элемэнтаў вытвару (струмэнты, будынкі і інш.). Гэты пагляд прыняло ў прынцыпе і законадаўства, пакладаючы на працадаўцаў ува ўсіх краёх, пакуль што, толькі часьць гэтых расходаў, — што выклікае ўжо скаргі і протэсты з другога боку, з боку рабочых, якія выстаўляюць трэбаваньне налажыць на працадаўцаў увесь матэр'яльны цяжар страхаваньне рабочых, г. зн. усе 6 проц.

Нямеччына зьяўляецца, як вядома краям, які першы завёў у сябе страхаваньне рабочых, а ласьне 38 гадоў назад. Дзеля гэтага паглядзім, які характар носіць страхаваньне рабочых на выпадак хваробы там, узяўшы даныя за дваццаць гадоў, з 1900 па 1920.

З ніжэйнаданае таблічкі мы можам бачыць, вялізны лік працаўнікоў застрахаваных ў касах хворых.

Гады	Застрахована асобау у (тысячах).		
	Мужчынау	Кабетау	Агулам
1900	7.314	2.207	9.521
1910	9.419	3.650	13.069
1914	9.842	5.768	15.610
1920	10.400	6.700	17.100

За дваццаць гадоў лік застрахаваных павялічыўся амаль што ў два разу — з 9 з палов. мільёнаў да 17 мільёнаў. У адносінах да ўсяго насяленьня застрахаваныя складалі ў 1900 г. 17 прац., а ў 1920 ужо 28 прац. Але сапраўды лік асобаў, на якіх закон аб

На матывы Р. Тагора.

Ты—Вялікі,
а маё жыцьцё падобна да гульні малых дзетак на пяску, пры рэчцы.

Яны будуюць заторы, кіруюць бег вады ў пракапаных дзяціннай лапатачкай каналы і дзіўна засмучоныя, калі неасьцярожна плёснуўшая хвалька змывае ўсе іх дзіцячыя хітрыкі.

Так я, забавіўшыся ў сваёй дзяцiннай гульні, забываюся аб Тваёй вечнай прысутнасьці, і толькі незнарок прыляцеўшы боль сьціскае мукай збалелае сэрца і змушае зьвярнуць да Цябе твар, Айцец мой.

І тады я чую, што глядзяць на мяне з ласкай Твае вочы і дзякую Табе, што разам з прыкрым болем, Ты даў мне шчасьце пазнаць Тваю сталую вечную прысутнасьць на нашай шумнай дзяцiннай гульні.

Ганна Галубянка.

* * *

Сэрца бьецца ад сьлёз,
Сэрца рвецца дамоў...
Толькі роўных бяроз
Не пачую я зноў!
У зямельцы чужой
Мушу я сумаваць,
Беларускай душой
Бяз пары паміраць.
А як хочацца мне
Пра куток свой пачуць,
Паляцець на вясьне,
Дзе браточкі жывуць.
Я-бы з імі хадзіў
Ад сяла, да сяла,
З імі-б жарты вадзіў,
Каб нядоля прайшла!

Югославія **М. Запольскі.**

* * *

Плакалі ў садзе бярозы...
Чыстыя, буйныя сьлёзы
Ціха каціліс з галін...
Клён ля вакна нагінаўся.
Нібы стагнаў ён, ці рваўся
К чарам ня нашых краін...
Вецер лісты залатыя
Гнаў праз алеі пустыя...
Сад і маўчаў, і шумеў...
Часам крумкач чорнакрылы
Рэзаў паветра бяз сілы,
Вышай ўзьляцеці ня сьмеў...
Восені чуліся чары...
Сунуліс хмары, бы мары,
Сунуліс ціха, бы дым...
Поўныя дзіўнай задумы,
Недзе радзіліся думы,
Ранілі смуткам сваім...
Хто і адкуль іх паклікаў?
Хорам ня лічаных зыкаў
Скуль яны, думы плывуць
Сэрца і так не сьмяецца,
Сэрца сьціскаецца, б'ецца,
Хоча заціхнуць, заснуць...

Н. Арсеньнева.

* * *

Чырванее заход ад мароза,
Пад нагамі парыпвае сьнег;
Быццам чорная думка з пагрозай
Змрок паўзе, выглядае з-пад стрэх.
К ночы вецер падняўся у боры
І бушуе з канца у канец,
А на вокнах зьявіліся ўзоры...
Эй, пара запаліць каганец!
Доўгі вечар зімовы бяз меры,
Песьням ветра ўважаць немага.
Сьлізкай гадзінай вузкай і шэрай
Абвівае ля сэрца туга...

Ул. Жылка.

Нязнаныя творы М. Багдановіча.

Па „Вянку" і па тых вершах, што друкаваліся ў разных часопісях, мы знаёмы з орыгінальнай творчасьцю нашага „песьняра чыстае красы", Максіма Багдановіча, Але ведама, што Багдановіч перш, чым пачаў пісаць, прайшоў добрую школу мастацтва, знаёмлючыся з лепшымі творамі сусьветнае літэратуры. Асабліва захапляўся ён вершамі Вэрлена, якія пазнаў у орыгінале. Вэрлен быў для Багдановіча вялікім вучыцялем, быў узорам музыкальнасьці, лёгкасьці і дасканаласьці формы верша. Ня дзіва, што, стаўляючы першыя крокі на літэратурнай дарозе, Максім Багдановіч пачаў перакладаць на беларускую мову творы свайго улюбленага паэта-вучыцеля, паслужыўшыя яму, як узоры мастацкае формы, годныя насьледаваньня.

Як сьведчыць пісьмо Максіма Багдановіча, прысланае ў рэдакцыю „Нашае Нівы" 31 ліпня 1912 году. наш песьняр пераклаў з Вэрлена (з французскіх орыгіналаў) дваццаць адзін верш: 1) Лыцар Няшчасьце, 2) Трэ' нам бачыш... 3) Ціхі і сіні, 4) О, сум, засьні... 5) Сон цёмны, 6) Асеньняя песьня, 7) Плач сэрца майго, 8) Захад, 9) Бач—месяц белы, 10) Пакуль, зорка, 11) Раялі цалуе тонкая рука, 12) У полі мрок, 13) Малюнак мора, 14) У полі дзікім, 15) Ракаўкі, 16) Душа твая, 17) Рака срэдзь вулкі, 18) Шынок, 19) Гул вулічных шынкоў, 20) Трэск дроў, 21) Ноч. Дождж. Гэтыя вершы былі перасланы ў Пецярбург—Суполцы „Загляне сонца і ў наша ваконца". Аднак у часе друкаваньня зборніку „Вянок" Багдановічу зажадалася зьмясьціць у ім і гэныя пераклады з Вэрліна. Насколькі цаніў аўтар сваю працу, відаць з слоў пісьма:

«Пераклады да арыгіналу блізкія і, калі я магу іх справядліва ацаніць,—добрыя. Калі піцерцы іх Вам падашлюць, дык Вы выкіньце дваццаць памянёных мною у лісьце (папярэднім—А. Н.) вершаў, і тады зборнік не павялічыцца. Ва ўсякім разе пераклады з Вэрлена больш вартыя друку, чым тыя трафарэты, да ліку каторых трэба прыпісаць і в. „Шмат у нашым жыцьці ёсьць дарог"... Ізноў прашу: друкуйце замест тэй дрэні, заклінаючы п. Антонія (Луцкевіча—А. Н.) імянем эўропэізма, культурнасьці і т. д., а п. Ластоўскага імянем модэрнізма і т. д."

У канцы пісьма прыпіска:

„Пасылаю Вам колькі вершаў з Вэрлена, каторыя друкруйце толькі тады, калі піцерцы прышлюць рэшту".

Як відаць, піцерцы рэшты ня прыслалі, дык цытаванае пісьмо з вершамі, папаўшы ў рукі тагачаснага сэкрэтара рэдакцыі, п. Ластоўскага, да ведама рэдакцыі „Н. Н." не дайшло. Яно і вершы былі знойдзены нядаўна ў падвале памяшэньня, дзе была рэдакцыя „Н. Н.", сярод рознага хламу, затаптаныя, струхлеўшыя ад вільгаці... І толькі цяпер перакладам з Вэрлена даводзіцца пабачыць божы сьвет.

Вершаў усяго сем, і мы іх усе тут друкуем. Пісаныя ў першы — найранейшы — пэрыод творчасьці Багдановіча, яны маюць сур'ёзныя недастаткі з боку мовы, часта нячыстай, з чысьленымі русіцызмамі. У цытованым вышэй пісьме Багдановіч сам заўважыў некаторыя з русіцызмаў і прасіў іх паправіць, што мы і спаўняем. Усё-ж значэньне іх для нашай гісторыі літэратуры ад гэтага не зьмяншаецца: гэта — узоры, на якія углядаўся наш песьняр, гэта—разьвязка пытань-

страхаваньні на выпадак хваробы пашырае свой уплыў, значна больш, бо да саміх застрахаваных трэба, па зусім зразумелай прычыне, даваць і сябраў іх сем'яў. І тады, без пераўвялічэньня можна сказаць, што даны закон пашыраецца, па крайняй меры, на ¾ насяленьня Нямеччыны.

Ад'значым пры гэтым працэнты кабетаў работніц. Лік іх з 2 з лішкаю міліёнаў у 1900 г. павялічыўся да 6, амаль не да 7 мільёнаў г. зн. тры разы. Прыпомнім, што кабеты, з прычыны бярэменнасьці й радоў, могуць адтрымліваць падмогу ў размеры поўнага заробку ў працягу некалькіх тыдняў да радоў і пасьля радоў. Лёгка зразумець, ня кажучы ўжо аб усім іншым, які ўплыў гэта можа мець на нараджэньне новага, здаровага і дужага пакаленьня, як гэта можа адбіцца на здароўі самае нарадухі і гэтым самым на палажэньні народнага здароўя.

(Канец будзе).

Усім падпішчыкам газэта высылаецца рэгулярна, -- хто не атрымлівае, няхай паведамляе аб гэтым адміністрацыю газэты.

Змаганьне за беларускія школы.

Нас паведамляюць, што сяляне Бельскага павету (Горадзеншчына) пасьля доўгіх безрэзультатных дамаганьняў беларускіх школ пастанавілі ў знак пратэста не пасылаць сваіх дзяцей у польскія школы.

Шэсьць польскіх школ з прычыны адсутнасьці вучняў зачыніліся.

1 кастрычніка 1922 г. Забрэзская гмінная Рада, Валожынскага пав. ухваліла адчыніць у районе гміны 7 беларускіх школ; пастанову Рады зацьвярдзіў Староста, але школьны інспэктар і слухаць ня хоча аб адчыненьні беларускіх школ, тлумачучы тым, што „białorusinów tu żadnych niema". У гвалтоўна адчыненыя праз яго 10 польскіх школ дзеці сялян ня ходзяць, чакаючы сваіх школ. Так у вёс. Вялікае Запрудзе той-жа гміны сяляне адчынілі прыватную белар. школу.

Лідзкі школьны інспэктар, каб запужаць сялян пагражае цяжкімі карамі дэлегатам, якія дамагаюцца беларускіх школ.

Аб памесным саборы.

У некаторых украінскіх і нават у беларускіх, а асабліва ў расейскіх кругох зьяўляюцца думкі аб скліканьні памеснага сабору для урэгуляваньня упраўленьня і палажэньня царквы праваслаўнае ў Польшчу. Не выказваючыся пакуль што, па істоце гэтае думкі, я цяпер хацеў-бы толькі ўспомніць аб рэзультатах эпархіяльнага зьезду вясной 1922 г. у Вільні. Успаміны аб гэтым я лічу зусім на часе.

Ведаем мы добра, як падбіраюцца на мясцох сябры зьезду і ад духавенства і ад парахвіянаў, і дзеля гэтага наперад можна прадбачыць тыя вынікі, якія даюць гэткія зьезды. Добра памятна нам та і барацьба, якую вёў памянёны зьезд з прадстаўнікамі Беларускай Цантральнай Школьнай Рады, якія дамагаліся на зьездзе пашырэньня агульна-адукацыйнага курсу сэмінарыі Вільні, ступнёвай яе беларусізацыі і утварэньня Багаслоўскага Інстытуту, каб даць магчымасьць, нашаму праваслаўнаму духавенству мець вышэйшую духоўную адукацыю. Помнім мы, які адпор давалі гэтым прадстаўнікам тыя асобы, якія найбліжэй стаялі да былога арх. Элеўфэрыга, памятаем добра, як усе гэтыя разумныя прапазыцыі, якіх патрабуе самае жыцьцё і інтарэсы нашае царквы на беларускіх абшарах, былі зьездам адкінены і як да ўсяго гэтага аднёсся наш былы архіяпіскам. Ен горача дзякаваў членаў зьезду за тое, што яны абаранілі духоўную школу ад ворагаў яе,— разумець трэба — ад тых, хто дабіваўся яе беларусізацыі. Вось яна—яскравая ілюстрацыя адносін былога галавы нашае Віленскае эпархіі да справы беларусізацыі ў нас царквы і духоўнае сэмінарыі, вось яна—яскравая старонка зьезду.

Ці ня можам спадзявацца мы, што і на памесны сабор будуць выбраны людзі, якія і надалей захочуць моцна праводзіць расейскі элемэнт у царкоўным жыцьці ў нас. Занадта доўга праводзілася ў нас русыфікацыя царквы, і сярод некаторых ня толькі духоўных, але і цывільных людзей пусьціла глыбака свае карані. Ці здолаюць яны, ўрэшці, адкараскацца ад гэтага расейскага чаду, ці прыдуць яны да здаровага зразуменьня патрэбаў і сілы аб'яднаньня беларускай думкі ў царкоўным жыцьці.

Досыць вядома кожнаму з нас, беларусаў, што сярод нашага праваслаўнага духавенства ёсьць нямала прыхільнікаў беларусізацыі церквы, але ня меньш вядома і тое, што выяўляць свае сімпатыі да беларускага руху і праводзіць іх у жыцьцё царквы нашай яны маглі б толькі тады, калі галава эпархіі будзе трымацца ў гэтых адносінах спагаднага погляду.

Нам дакладна ведама, што па абшарах украінскіх, што ў межах Польшчы, ўжо ў значнай меры праводзіцца украінізацыя царквы, ужо ў духоўнай сэмінарыі ў Крямянцы выкладаюцца усе прадметы, апрача багаслоўскіх навукаў, ў украінскай мове, а ў нас, беларусаў, справа гэтая стаіць яшчэ дужа дрэнна. Мы адсталі ад сваіх найбліжэйшых братоў, занадта адсталі і ў рэформе духоўнае школы і ў беларусізацыі духавенства нашага і самае царквы.

І ў той час, як украінцы гатовы ужо, быць можа, разглядаць на саборы ўсправу упраўленьня царкоўнага з боку фармальнага і праўнага, як наагул палажэньне праваслаўя ў граніцах Польшчы, я хачу запытацца, а ці гатовы мы, беларусы, да гэтага?

Справа гэтая — справа актуальная сягоняшняга дня; над гэтым пытаньнем варта добра застанавіцца беларускаму сьвядомаму грамадзянству.

П. Р.

◆◆◆◆

Допісы.

Не даюць нам школ. Докшыцкая гміна. Доўгі час школьная ўлада ні адчыняла ў нас ніякіх школ. Нарэшце, месяц таму назад, школьная ўлада адчыніла тры польскія школы. Хаця абшар гміны з поўначы на поўдня цягніцца на 33 вярсты, але ўсе гэтыя 3 школы адчынены ў адным мейсцы, так што, школа ад школы адстаіць у працягу 2—3 вярсты, там дзе жывець выключна каталіцкае насяленьне.

Тыя вёскі, якія дамагаліся школ беларускіх, ніякай адповедзі да гэтага часу не атрымалі. Ужо не кажучы аб вёсках Асовах, Таргунах, якія даўно і безупынна патрэбуюць адкрыцьця беларускіх школ, але вёска Папоўшчына з іншымі суседнімі вёскамі, маючы добрае да ваенных часоў памешканьне для школы, ніяк ня можа дачакаць дазволу адчыніць сваю школу, хоць усе нязлічоныя фармальнасьці даўно выпаўнены.

Вялікая крыўда наносіцца гэтым усім сялянам нашай гміны. Але мы прывычны ужо цярпець і яшчэ пацерпім. Праўду казаў наш песьняр: „Як крыві не стане, тады кончу граньне".

Берніна.

Спрытны адміністратар. (Дзісеншчына). Рэвіровы Станкевіч у 1920 годзе патрэбаваў ад сялян Шаркаўскай, Іодскай, Н.-Пагостцкай і Перабродзкай гмін, каб яму купілі 2 канёў на раз'езды. Грошы былі сабраны і коні куплены. У 1921 г. загадаў сабраць 50 пуд. аўса і 100 п. сена і гэта было выпаўнена. У 1922 г. прадаў коні і санкі Санкі стайковым загадаў зацягнуць у м. Глыбокае, але іх чамусь новы ўласьнік ня прыняў. Па незразумелай прычыне ўся віна пала на солтыса, якому строгі начальнік пагражае астрогам. Словам, п. Станкевіч самадзяржавіць у сваім районе.

Паны ня дрэмяць. У Дзісенскім павеце заварушылі паны. У Дзісьне ў памешканьні польскай гімназіі адбыўся зьезд прадстаўнікоў польскага элемэнту. Зьезд паслаў дэлегата ў Варшаву з просьбай аб дапамозе арганізацыі «Саюзу Самаабароны». У хуткім часе былі атрыманы грошы, аружжа і інструктары. Лішняга сабе клопату задаюць паны.

Лаг.

◆◆◆◆

Бібліяграфія.

Л. Родзевіч, Беларусь, Вільня. 1922. *Друкарня „ДРУК", Субач,* 2.

У лірычнай творчасьці рэдка трапляецца яснае імкненьне — у асабістых перажываньнях адбіць рытм сучаснасьці, абхапіць яе, даць прарочы прагноз неадзоўна надыходзячай будучыны.

Дзеля гэтага і набірае асаблівай вартасьці невялічкі зборнік лірычных твораў Л. Родзевіча «Беларусь», ў ялім ня аб чужых літэратурных уплывах на творчасьць Максіма Багдановіча*).

Ант. Навіна.

1.

Chanson d'automne.

Як раньш, пяе
І ў сэрца б'е
Сумны тон.
То, восень, іх,
Бальных тваіх
Скрыпак стогн.
Чу! Часу ўдар!
Блее твар.
Рвецца ўздых:
Устаў карагод
Мінулых год,
Дзён былых.
А віхр ліхі,
Што ў лісьць сухі,
Дзьме ў мяне.
Нясе туды,
Нясе сюды,
Удаль імкне.

2.

Son joyeux, importun d'un clavecin sonor.
Пэтрі Борэль.

Раяль цалуе тонкая рука
У час вячэрні, шэра-ражаваты;
І на крылах, цішэй ад вецярка,
У паветры мяккім, пекным паплыла ты
Тужліва, песьня, і срэдзь комнат хаты
Шчэ доўга веяў пах, як ад цьвятка.
Што за калыска ціха так гайдае
Стамлёнага, бяздольнага мяне?
Чаго, як жэўжык, песьня вымагае?
І што ў канцы яе прыпеў жадае,
Каторы гэтак хутка у вакне,
Адчыненым на садзік, заміраe?

3.

О, сум, засьні ў душу маей,
Сум па кабеціне аднэй.

Я ня усьцішыў горкіх сьлёз,
Хоць сэрца ў даль ад ей панёс.

Хоць сэрца, хоць душу сваю
Удалі ад ей даўно таю.

Я ня ўсьцішыў горкіх сьлёз,
Хоць сэрца ўдаль ад ей панёс.

І сэрца, сэрца так стучыць
Душэ маей: „Ці можа быць,
„Ці будзе зноў разстаньня сум,
„Разстаньня гордасьць, долі глум?"

Душа яму дае адказ.
„Як ведаць, мо сіло на нас,

„Каб скуты мы і з ёй былі
„Нам у разстаньні і ў далі."

4.

Зіяньне месяца.

Душа твоя -- малюнак артыстычны
Пад лютняў звон прыгожы масак рой
Танцуе там, адзеўшыся нязвычна,
У надзеі скрыць праз гэта смутак свой.

На ціхі лад усе яны сьпяваюць
Пра мір жыцьця і сьветлую любоў,
Ды веры ў шчасьце сьпевы іх ня маюць,
І з ясным сьветлам зьліты зыкі слоў,

Са сьветлам месяца прыгожа-смутным,
Ад чар чыіх на дрэвах птушкі сьняць,
І лёкія струі у плачы чутным
Між мармураў натхнёна зіхацяць

5.

Покуль, зорка, ўраньні твой
Бледны бляск яшчэ зіяе,
(між травой
перапёлак цьма сьпявае)

Абярніся, глянь ка мне
У вочы, поўныя каханьня,
(к небу мкне
стая жаваранкаў зраньня).

Кінь пагляд, што ледзь відаць,
Бо нябёсы зьяюць сіня,
(шум чуваць,
гул вясёлы у даліне!)

І каханьня думкі ўдаль
Панясі на сьветле шпарка
(быццам сталь,
траў раса бліскае ярка).

К мілай, што салодка сьніць,
Іх прымчы цераз ваконца.....
(трэ сьпяшыць,
бо вось-вось зазьяе сонца!)

6.

Il pleure dans mon cocur....

Плач сэрца майго,
Як над горадам дождж.
Скуль расьце, дзьля чаго
Смутак сэрца майго?
Шум ціхі дажджа
Над будоўляй, зямлёй...
Ты скучала, душа,
Раньш па песьні дажджа.
Шчыміць бяз прычын
У бедным сэрцы маім.
Ужо няма злых часін,—
Гэты плач—бяз прычын.
Няма горш бяды,
Як рыдаць ні з чаго,
Без надзей і нуды;
У мяне шмат бяды.

7.

Il faut, voyez vous, nous pardonner les choses.

Трэ' нам, бачыш, усё між сабой дараваць,—
Так хоць шчасьце нарэшце спаткае абох,
А і прыдзецце гора ў жыцьці нам зазнаць,
Дык прынамсі... ці-ж не?... будзем плакаць у двох.

Мы - дзьве родны душы; о, калі б мы маглі
Сны бажаньняў з дзіцячаю радасьцю зьліць,
Што йдземо ад мужчын і кабет удалі,
Аб выгнаньні патрапіўшы ў шчасьці забыць!

Зьвернямось-жа ў дзяцей, у дзяўчатак малых, —
Ні любві, ні зьдзіўленьня ня маюць яны,
У лес, збляднеўшы, ідуць ад паглядаў людзкіх
І ня ведаюць нават, што ўжо прашчаны.

Я р а с л а ў л ь, 1912 г.

*) У тым-жа пісьме, в якім Багдановіч прыслаў друкаваныя тут пераклады з Вэрлена, ён кажа, што мае пераклады так-жа з Горацыя і Овідыя. Дзе яны апынуліся, няма ведама.—А. Н.

◆◆◆◆

ёсьць сьмелая спроба ў лірычных формаф даць сінтэзу беларускага Быту.

Ня глэдзячы на малы лік твораў — усяго 16—і на невялічкі разьмер каждага з ніх, зьмест зборніку становіць адну неразрыўную суцэльнасьць і пры іншым успасабленьні аўтара мог-бы выліцца ў паэму, якое уляжылася бы пад тым жа самым загалоўкам «Беларусь».

Вось разьвіцьцё гэтай паэмы: перш — Сучаснасць, цярністы шлях „Ў цьме праз галовы зьмей, праз кроў, праз руіны, равы", час роспачы і няпэўнасьці, атручаны пытаньнем:

— „Братка, а можа мы блудзім?"
спробы знайсьці апраўданьне, супакой, веру:

—„Ня тужыце беларусы, сон то-моц"
неясныя надзеі на будучыну.

Але надыходзіць час змаганьня, слаўнай пабеднай барацьбы:

„Устаюць, устаюць, гудуць роямі.
Ударнымі хвалямі шыраць круг берагаў..."

І далей ліюцца ня туманныя думкі-песьні аб жаданым світаньні, а пышнымі краскамі расквітае самае Адраджэньне:

„...з замелькі-маці мае арадзіцца
у кашульцы шчаснай Беларусь сінявока.
Даставай жа Юр'я ключы залатыя,
расчыняй пакоі яснавеснавыя.
Падмятай-жа Пётра з хмар покоі тыя,
Ярам пасып ад Няпра да Беластока
А Ільля на нечысьць з стралой пяруновай..."

У закончэньні паэмы арганныя рытмы малітвы-гімну, натхнёнага творчасьцю вялікага сучаснага прарока Р. Тагора, завуць падарожных нашых непраходных пушч," прысьці „ў хату вясковую пахілую" каб знайсьці там супакой сваім душам і узрадаваць засмучанага Гаспадара.

Такі зьмест паэмы, сплеценай з рожнакалёрных лірычных вузораў.

Лірыка Л. Родзевіча адзначаецца тым, што найбольшай выразістасьці шчырасьці дасягае паэт і захапляе чытача сілай пачуцьця ў тых вершах, у якіх ён глядзіць на рэчы не праз прызму сваей асобы, а нібы беспасрэдна разьліваецца ў іх.

На жаль, такі „эгоцэнтрычны" спосаб гледжаньня на сьвет, калі асоба аўтара застаецца ў цэнтры творчасьці застаўся, як шкодная традыцыя беларускай лірыкі і ўсе вершы, лірычны зьмест якіх пераломлены праз аўтарскае „я", напр., „У гразь утоптана ляжыш", або „Няўжо я шчасьця "— значна слабейшыя, дзе аўтар без астатку зліваецца з выкліканымі да жыцьця абразамі, як „Ідзе у цьме" „Разсьвяткуйся неба".

У вершах апошняга характару аўтар з найбольшай сілай выяўляе зьмест Беларусі. Трэба пашкадаваць, што ў зборнік ня трапіў наймацнейшы па напружаннасьці выяўленьня беларускай Істоты твор паэты „Лявоніха", які трэба прывесьці цалком, каб папоўніць недастаючае звяно паэмы:

Рунь, пралескі доўга мучыў стары сьнег,
а як сонца напужала, дык пабег
ў лес схаваціся да сьвята Саракоў.
Посьле травень маем вымеце ў роў.
Шум і гам пад рукі оха ўзялі
з печы весела на прызбы павялі.
А на выгане бушуюць бугаі.
Лескавік русалку соча ў гаі.
Не сьцярпеў нябесны Юр'я ды ураз
падцягнуў падол свой ёмка пад паяс,
весялушку-Лялю крута падхапіў
і на луве з ёй Лявоніхай паплыў.

Што да формы вершаў зборніку, да мовы іх, дык паэта прытрымліваецца, нагул, сымволічнай абразнасьці, прабуючы сілы на шляхох індывідуальнага шуканьня, падчас даволі сьмела, але заўсёды сьвежа і самавіта; напр.

„Каб памёршы—уваскросла,
зьела блін, надзела боты!..
або —Здрада, здрада,
Сувязь адступніка—гада
з трупам блудніцы прадажнай,
родам з шляхты лішне важнай!..

Тэхніка ломанага рытму дае больш прастору самаволі паэта, але мэтрычны верш, асабліва напісаны трохскладной стапой вымагае ўвагі. Ніцастача яе падпсавала „Белую музыку", ў якой некаторы верш трэба чытаць ломаючы гармонію вершу:

„Ты, муза, народу працай пачэснае"

Таксама паэт не высьцярагаецца, каб ў лірычную творчасьць не пранікала дыдактыка асабліва ў пацыяналістычным духу. Дзеля гэтага, пявучы, музыкальны пачатак „Мінуўшчыны" сапсуты апошняй навучальнай страфой:

„Вось тады не мячом Полацк край ратаваў, —
Моцай веды сваей Вільню ён пакапаў.
З дзікіх, цёмных лясоў вывеў ворага ён,
у рукі сьветач ім даў, даў ім правы закон".

Але калі трудна высьцерагчыся тэндэнцыі, дык усе абмылкі гэтага характару выкупляе шчырае прызнаньне паэта:

„...Кроў, душу даю,
як ахвяру, дар
не за твой абшар,
гаспадарскі лад,
а за моц сваю,
тайну тайн тваю,
п р а ў д у с е л ь с к і х х а т.

Пераходзячы да вывадаў, трэба аднатаваць, што творчасьць Л. Родзівіча ўкладае пешта новае ў беларускай паэзіі.

Здаровая, поўная сілы лірыка, якая ўмее не затрымлівацца ў мрочных кутках чалавечага духу, а ідзе разьлівацца ў шырокае мора ўсесьветнай творчасьці, злучна з драматычным пахілам, які выразна зазначыўся, вось — элементы гэтай творчасьці. Са старонак зборнічка сьмела праглянула новая поэтыцкая індывідуальнасьць, якая выразна намечае і цярэбіць сабе сьцежку.

I. Л.

◆◆◆◆

З Вільні.

Глумленьне над літоўцамі.

У канцы сьнежня мінул. году літоўскія прытулкі, якія знаходзяцца на вул. Субач 23 і Вострабрамскай 12, атрымалі ад Дырэкцыі Robót Publicznych затрэбаваньне пакінуць занятыя памешканьні да 1 красавіка г. г.

У 1922 г. месцовая адміністрацыя выкінула 169 дзяцей-сірот з літоўскага прытулку на Субач № 16, якія былі размешчана ў двух названых прытулках. З гэтай прычыны сотні дзяцей змушана былі жыць у страшнай цеснаце і дрэнных гігіенічных абставінах. Апрыч таго ў прытулках знаходзіцца ўся гаспадарка Літоўскага К-та памачы ахв. вайны: коні і ўвесь інвэнтар, галоўны склад для прадуктаў.

Няўжо месцовая адміністрацыя адважыцца выкінуць на вуліцу сотні дзяцей сірот, пазбавіўчы іх грамадзкай апекі і гэтым зруйнаваць дабрачынную установу, нішчучы усю зробленую да гэтага часу працу, карысную для грамадзянства?

Зьезд літоўскіх вучыцялёў.

30 сьнежня адбыўся зьезд вучыцялёў літоўцаў. Мэта зьезду разгледзіць школьныя і агульна-прасьветныя справы

◆◆◆◆

З Беларускага жыцьця.

◆ Н. Арсеньнева перакладае на беларускую мову „Dziady" А. Міцкевіча.

◆ Макар Косьцевіч пераклаў на беларускую мову „Мцыры" Лермантава.

◆ Вышла з друку і прадаецца у Беларускай кнігарні (Завальная 7) „Хрэстаматыя беларускае літэратуры" М. Гарэцкага.

◆ „Птушка шчасьця" пьеса Ф Аляхновіча пералажыла на украінскую мову Галіна Орлівна. Пьеса ў хуткім часе будзе надрукована ў Львове.

◆ Беларускае грамадзянства гор. Вільні спатыкала Новы Год у Беларускім Грэмадзянскім Сабраньні, дзе адбылося прадстаўленьне і кабарэ пры учасьці дружыны беларускіх артыстаў. На спатканьні былі прысутнымі беларускія паслы.

◆ 2 студня ў залі Драматычнае Майстроўні адбылася беларуская вечарына, на якой прадстаўлена была апэрэта „Іваноў Паўла" пабеларуску.

◆ Беларускі вучыцель Г. Крыткоўскі, арыштаваны за прадвыбарную агітацыю, выпушчаны на волю пад залог 500.000 марок.

◆ Газэта паведамляюць, што біскупам-суфраганам у Навагрудку назначаны ксёндз беларус Абрантовіч Вестку гэтую з радасьцяй сустрэла беларускае грамадзянства ў Вільні, бо кс. Абрантовіч вядомы ўсім як выдатны беларускі адраджэнец і чалавек вялікай навукі.

◆ Вучні старшых клясаў Беларус. Навагрудзкай Гімназіі прасілі Пэдагагічную раду дазволіць ім пасьля лекцыяў і ў сьвяточныя дні зьбірацца для разбору беларускае літэратуры і на арганізацыю Гуртка Моладзі. Рада, пасьля доўгіх разваг усёткі адмовіла вучням. Вучні страшна абураны гэткім паступкам Пэдагагічнай Рады

З дапамогай вучыцялёў Ціхаиоўскага і Данілевіча ладзіцца вучнямі бнларуская вечарына на Каляцныя сьвяты.

◆ Вучні Радашкоўскай гімназіі ладзяць вялікі вечар на праваслаўныя Каляды. Пастаўлена будзе апэрэтка „Боты" і дывэртысмэнт.

◆ Беларускі Пасольскі Клюб надрукаваў у № 34 „Бел. Звону" і разаслаў па правінцыі асобныя адбіткі выданых ім анкетаў па пытаньнях аб зямлі, аб вайсковай калёнізацыі, аб аграрна-эканамічнай дапамозе бежанцам, аб нішчэньні лясоў і ў справе беларускае асьветы, з просьбай да беларускага грамадзянства аб апрацаваньні кожнай анкеты па раёну у с я е г м і н ы, аб поўным і акуратным адказе на кожнае запытаньне ў анкетах і аб адсылцы іх па адрэсу: Warszawa, ul. Wiejska. Sejm. Białoruski Klub Poselski.

◆ Цантральная Беларуская Школьная Рада даводзіць да ведама сяброў Т-ва Беларускае Школы, што 14 студня 1923 г. (у нядзелю) ў Вільні, Біскупская 12 (памешк. Белар. Клюбу) а 12 гадз. дня назначаны агульны вялілі сход сяброў Т-ва Белар. Школы дзеля разгляду справаздачы старога Ураду і выбараў новага. Калі згодна § 34 Статуту ня прыбудзе устаноўленага ліку сябраў, сход адложыцца на дзень 28 тагож студня бяз зьмены яго гадзін і мейсца і будзе лічыцца правамочным, не зважаючы на лік прыбыўшых сяброў.

◆ На днях пачне выходзіць сялянская беларуская газэта лацінікай „Krynіса", год выданьня сёмы.

◆ У хуткім часе Беларускае Грамадзянскае сабраньне абвясьціць дзень выдачы прэміяў на сцэнічныя творы.

З жыцьця студэнтаў.

У Празе.

14. XII. 22. у памешканьні „Umeleska Beseda" адбыўся чэшска-беларускі літэратурна-музыкальны вечар. Публіка была спэцыяльна па запрашэньню; былі віднейшыя чэшскія прафэсары, музыканты, літэратары і грамадзкія дзеячы. Праграма вечара была такая: чэшскі квартэт (музыка Dvoraka) даклад проф. Ляцкага аб культурна-нацыянальным адраджэньні Беларускага народу і хор беларускіх студэнтаў пад упраўленьнем Кізімы прапеяў „Ды ўжо сонейка" і „Чаму-ж мне ня пець" — і кароткі рэфэрат прачытаў Т. Грыб аб беларускай казцы і песьні народнай (у канцы прачытаў дзьве казкі „Ільля і Пятро" і „Дзе чорт сам ня зможа, там бабу пашле, — верш Багушэвіча) затым хор беларускіх студэнтаў прапеяў „Ці ня дуцка мая" і ў канцы Оля Мамоньчыха соло прапеяла народныя песьні: „Памру, памру маці" і „Ах ты Нёман рака". На просьбе публікі хор беларускіх студэнтаў яшчэ раз на заканчэньне прапяяў „Чаму-ж мне ня пець, чаму-ж ня гудзець".-

Вечар прайшоў вельмі ўдачна.

Гэта было першае выступленьне з беларускай народнай творчасьцяй і песьняй прад чэшскім грамадзянствам, якое вельмі цікавіцца адраджэнскім рухам беларускага народу.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

Афіцыяльна за 4 студня.

Нямецкія маркі	— —
Франкі франц.	1.293
Доляры	17.870
10 руб. золатам	95.000

Абвестка.

У нядзелю 14 студня г. г. а 4 гадз. ўвеч. ў памяшканьні Беларускага Грамадз. Сабраньня (Біскупская, 12) адбудзецца **агульны сход** сяброў Віленск. Белар. Т-ва помачы пацярпеўшым ад вайны, на які запрашаюцца ўсе сябры Т-ва.

Парадак дня:

1) Справаздача Камітэту.
2) Рэарганізацыя Т-ва.
3) Бягучыя справы.

Камітэт.

Кожны беларус павінен чытаць сваю газэту.

Выпісывайце і складайце ахвяры на сваю газэту.

Загад мітрапаліта Юрыя аб карыстаньні беларускай мовай у царкве.

Віленс. Духоўн. Кансыст. атрымала такі загад ад Мітрапаліта Варшаўскага Юрыя: „Згодна з выказам Найсьвяцейшага Патрыярха Маскоўскага а так сама згодна з пастановай Асьвячонага Сыноду ад 14 сьнежня г. г. (журнал № 24 ст. 6) і зносін з Міністэрствам народнае асьветы і веры, аб карыстаньні пры набажэнствах роднай мовай народу (украінская, беларуская і г. д.) гэтым даводжу да ведама Віленскай Кансысторыі, што непавінна рабіцца ніякіх перашкод пры карыстаньні беларускай мовой у час набажэнства для прамоваў (пропавядзяў) духоўных бяседах і гугарак—у тых парахв. як дзе гэта пажадана для парахвіян і дзе сьвяшчэннікі досыць добра ўладаюць беларускай мовай.

Карыстаньне беларускай мовай у азначаных прыпадках павінна выключна мець мэту як найлепшага знаемства праваслайнага люду з догматамі Праваслаўнае Царквы і навукай яе аб маралі так і дапамогі найбольш значным уплывам навукі Праваслаўнае Царквы на людзкія сэрцы, а так сама умацненьню праваслаўнага люду ў веры і дабрачыннасьці, што„ па ўсе карысна ёсьць маючы абетаваньне жыцьця цяперашняга і будучага".

Варшава 27 сьнежня 1922 г. № 1510.

Юрыдычнае бюро

Беларускага Таварыства дапамогі ахвярам вайны прыймае па справах юрыдычных, судовых, адміністратыўных і іншых, а такжа па справах, якія могуць і павінны быць вырашаны праз беларускіх прадстаўнікоў у Сойме і Сэнаце.

Даюцца парады, пішацца заявы, просьбы і інш.

У Бюро працуюць адвакаты беларусы.

Бюро прыймае штодня ад 10—2 і ад 5—7 гад. (Вільня, Віленская 12—6).

У Мункачове (Чехословакія) **ладзіцца да выданьня каталог усходня-славянскай прэсы, ў тым ліку і беларускай.**

Просьба прысляць адрасы ўсіх беларускіх газэт, журналаў, якія дзе выдаюцца, а такжа адрасы выдавецтваў, кнігарняў, бюро друку.

Пажадана было-б атрымаць гэткія інфармацыі: **названьне, год выданьня, перыяд выданьня, лік друкаваных экзэмпляраў, фармат, палітычны напрамак, адрас рэдакцыі і адміністрацыі, адрас выдаўца, адпаведнага і галоўнага рэдактара і карэспандэнтаў, сьпісак пастаянных супрацоўнікаў, падпісная плата і цана абвестак, прадстаўніцтвы за граніцай.**

Прысылаць па адрэсу: Ivan Vysloцki, Munkaczevo, post. schr. cz. 8, Tschecha-Slovakia.

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК" Субач, 2.